■ Вернісаж

# ПРЫГАЖОСЦЬ СЯРОД ХЛЕБНЫХ ПАЛЁЎ

**З 27 чэрвеня да 29 ліпеня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага будзе працаваць фотавыстаўка Ірэны Гудзіеўскай «Сімвалы Беларусі. У пошуках...». Праект прысвечаны Году малой радзімы.**

«Буслы, зубры, лён. Хлебныя палі і васількі. Палессе і пушчы. Замкі і вежы... Калі і чаму яны сталі сімваламі Беларусі? Што мы ведаем пра іх і ці ўмеем імі ганарыцца? Фотапраект «Сімвалы Беларусі. У пошуках...» імкнецца данесці да кожнага сэрца годнасць і аптымізм беларускіх сімвалаў, тое міфічнае і сапраўднае, што ўтрымліваецца ў генетычнай памяці самога народа, — мяркуе **арт-крытык, кіраўнік секцыі фотакрытыкі Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў Любоў ГАЎРЫЛЮК.** — За кожным пейзажам фотамастачкі Ірэны Гудзіеўскай — шчырая гісторыя, за кожнай фарбай у апярэнні птушкі — звычай або песня. І расказаны яны візуальнай мовай сучаснага чалавека — праз мастацтва фатаграфіі».

Праект «Сімвалы Беларусі» — гэта працяг вялікай аўтарскай тэмы «Зачараванне», якую Ірэна Гудзіеўская пачала больш за восем гадоў таму разам з Тамарай Ганчаровай з трох сімвалаў — «Пушча. Лён. Прыгажуні». Яна была прадстаўлена ў Беларусі, у многіх еўрапейскіх краінах і ў ЗША.

На выстаўцы «Сімвалы Беларусі» экспануецца каля 80 фotaработ на палотнах, друк якіх стаў магчымым дзякуючы падтрымцы Пріорбанка. Дарэчы, фотаработы Гудзіеўскай, прысвечаныя беларускім сімвалам, натхнілі пісьменніцу Лёлю Багдановіч на цыкл «Бабуліны казкі», якія на радыё «Мінская хваля» чытае Тамара Вяцкая. Кампазітар Леанід Шырын напісаў выдатную музыку для праекта.

Варта дадаць, што Ірэна Гудзіеўская зазвычай працуе ў галіне мастацкай фатаграфіі і рэкламы. Пачала свой творчы шлях яна з выстаўкі 64 Eme Salon de Printemps у Парыжы ў 1994 годзе. З гэтага часу Ірэна актыўна ўдзельнічае ў буйных выставачных праектах, уваходзіць у склад журы конкурсаў моды і дызайну, стала пераможцай міжнародных фестываляў рэкламы, супрацоўнічае з беларускімі, расійскімі, еўрапейскімі часопісамі. Да таго ж Ірэна Гудзіеўская — член Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў.

**Варвара ГОМАН** ■



**Фотаработа Ірэны ГУДЗІЕЎСКАЙ.**

# ПРАЙСЦІ ПРАЗ АГОНЬ І ПАЛАСУ ПЕРАШКОД



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Паміж МНС і БРСМ заключаны дагавор аб супрацоўніцтве, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях па Мінскай вобласці Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Хлопцы з маладзёжнай арганізацыі ўдзельнічаюць у пажарна-прафілактычнай рабоце. Мы ж прапанавалі пашырыць фармат стасункаў і ўвесці сюды практыку «выпрабавана на сабе». Спазнаўшы такім чынам некаторыя нюансы працы ратавальнікаў, як мы разлічваем, «стажоры» не разгубяцца ў надзвычайнай сітуацыі і здолеюць правільна арганізаваць людзей.



Што ж менавіта чакала васьмярых юнакоў? Перш за ўсё — тэарэтычная падрыхтоўка. А восьмай раніцы яны прысутнічалі на прыёме і здачы дзяжурства. Ратавальнікі паказвалі, як правільна правяраць абсталяванне, баявое адзенне, тэхніку. Бо ў любую секунду можа раздацца званок — і разлік паедзе ліквідаваць чарговы пажар. Адбор юнакоў ішоў па ўзроставым і фізічным прынцыпе. Напрыклад, чалавек драбнаватай камплекцыі наўрад ці вытрымае поўную амуніцыю, якая важыць больш за 15 кілаграмаў. Да таго ж у ёй трэба яшчэ і перасоўвацца, і нават на васьміметровую вышку залезці падчас праходжання псіхалагічнай падрыхтоўчай паласы.

— Яна чакае ўсіх ратавальнікаў, якія прыходзяць на працу, — працягвае Анастасія Швайбовіч. — Не кожны чалавек рызыкне сунуцца ў дым. А калі пажарны заходзіць у палаючы дом, то бачнасць там, як правіла, нулявая. І дзейны асабовы склад таксама перыядычна трэніруецца на гэтай паласе.

— Паласу будзем праходзіць па аддзяленнях, — камандуе перад строем **начальнік дзяжурнай змены пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Ігар ІВАНСКІ.** — Звяртаю асаблівую ўвагу на ахову працы. Будзе гарэць агонь. Нікуды не спяшаемся, робім усё павольна і ўпэўнена. З лесвіц не саскокваць. Там, дзе гарыць, — працуем толькі ў масках і пальчатках. Канатную дарогу праходзім толькі пасля таго, як дасць дабро камандзір. І ніякай самадзейнасці! А цяпер праводзім размінку...



Фізкультурныя практыкаванні неўзабаве змяняюцца інструктажом адносна амуніцыі.

— У балоне са сціснутым паветрам ціск — 300 атмасфер, — працягвае Ігар Іванскі. — Самі разумееце, гэта вельмі шмат. Таму тут ёсць рэдуктар, які паніжае ціск. Глядзіце ўважліва на манометр. Чырвоная зона паказвае 50 атмасфер. Калі ціск упадзе да гэтай адзнакі, то спрацуе свісток. У такім выпадку ўсё звяно адразу выходзіць на чыстае паветра. А зараз надзяваем апарат і зацягваем яго шлейкамі, каб не матляўся. Пасля яго — маску. Не травіць нідзе паветра? Ну то добра.

І ў гэтыя хвіліны над псіхалагічнай паласой уздымаецца агонь і чорны дым.

— Пайшлі!!! — камандуе Ігар Іванскі.

Аддзяленне пачынае штурмаваць вышку. На вышыню ў восем метраў трэба залезці па вузкай лесвіцы і па ёй жа спусціцца. Затым прайсці па падвесным жалезным мосце, які гойдаецца ад любога дотыку. Далей стаіць сапраўдная цыстэрна, па якой трэба ўзлезці наверх — і спусціцца па невялікай жалезнай лесвіцы. І гэта яшчэ не ўсё! Бо трэба прайсці паласу перашкод: пралезці праз рагаткі ў вузкіх месцах, затым пераадолець метраў пяць на адных руках, прабраўшыся па канаце — а ўніз цягне балон... Пасля невялікага адпачынку хлопцам трэба падняцца на вышыню чатырохпавярховага дома па лесвіцы з аўтавышкі.

— Караскацца ў баявой экіпіроўцы, з апаратам сціснутага паветра — гэта зусім не тое, калі параўноўваць са звычайным пад'ёмам па лесвіцы, — гаворыць **начальнік аддзела ідэалагічнай работы Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Дзмітрый СВЯТАГОР.** — Прычым падняцца лёгка, а ўніз спускацца вельмі цяжка. Тут пастаянна трэба адчуваць канструкцыі, манеўраваць. Максімальная вышыня вышкі — восем метраў, гэта імітацыя трохпавярховага дома. Рагаткі, напрыклад, імітуюць падвалы або завалы дамоў.



І вось на паласе перашкод фінішуе першы хлопец. Ён здзірае з сябе маску і прагна ловіць паветра. Падбягаем да яго, цікавімся: ну як?

— Спусціцца з апошняй вышкі — самае цяжкае. Не думаў, што будзе настолькі складана, — кажа, аддыхваючыся, прадстаўнік Маладзечна Андрэй Трывашкевіч.

— Ніколі не думаў, што так павольна можна працаваць, але стамляцца настолькі моцна! — дзеліцца ўражаннямі Сяргей Багданаў з Мядзела. — Але ўсё было вельмі крута! Падымацца-спускацца з лесвіцы з амуніцыяй і балонамі было цяжэй за ўсё. А вось у псіхалагічным плане мне было не вельмі страшна...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**